# Рэцэнзіі

К.Ф.Гуценко, М.А.Ковалев. **Правоохранительные органы** / Под ред. Проф. К.Ф.Гуценко. М.: изд-во БЕК, 1995. 299 с.

Выход в свет рецензируемого учебника, рекомендованного Московским государственным университетом им. М.В.Ломоносова для студентов юридических вузов и факультетов, следует приветствовать и у нас, в Республике Беларусь. Изданные в 1990 и 1991 гг. учебники "Правоохранительные органы в СССР" (В.М.Семенова и под редакцией проф. К.Ф.Гуценко), по которым учились студенты всех республик бывшего Союза ССР, безнадежно устарели. В БССР учебники по данной дисциплине вообще не издавались. В 1977 г. было опубликовано лишь учебное пособие И.И.Мартинович, Е.Ф.Плюта "Суд и правосудие в БССР". В настоящее время кафедра уголовного процесса и прокурорского надзора Белгосуниверситета планирует подготовку учебника по подобному курсу, однако для этого потребуется время. Поэтому и с этой точки зрения указанный российский учебник представляет для нас интерес и может быть использован в качестве пособия при изучении студентами судоустройства стран СНГ (такая тема предусмотрена учебной программой преподаваемого у нас предмета "Судоустройство").

В учебнике К.Ф.Гуценко и М.А.Ковалева в соответствии с новой учебной программой и с использованием новейшего правового материала, а также достижений правовой науки обстоятельно и последовательно освещаются как общие вопросы курса (понятие правоохранительной деятельности, ее содержание и основные функции; понятие судебной власти и ее место в государственно-правовом механизме; понятие правосудия, его социальная роль и значение и др.), так и положения, касающиеся построения и полномочий судов, прокуратуры, органов юстиции, дознания и следствия, прокуратуры в Российской Федерации. Несомненным достоинством книги является деидеологизация рассматриваемых вопросов, отказ от одностороннего партийного подхода к изложению учебного материала. Авторами дается глубокий юридический анализ норм Конституции РФ 1993 г., Закона о статусе судей в РФ 1992 г., Закона о прокуратуре РФ 1992 г., Закона о Конституционном суде РФ 1994 г. и других нормативно-правовых актов, принятых в соответствии с концепцией судебной реформы. Подчеркивается значение общепризнанных принципов и норм международного права, связанных с организацией и деятельностью юстиции России. Словом, предлагаемый учебник дает будущим юристам четкое представление об организации и функционировании суда и правоохранительных органов, активно участвующих в реализации правовых предписаний, подготовит их к изучению других профилирующих юридических дисциплин.

Поучителен учебник и в методическом плане. По каждой главе студентам рекомендуются конкретные правовые акты с указанием источников их официального опубликования. Каждая глава содержит контрольные вопросы по теме, а в конце учебника приводится текст учебной программы по данному курсу.

Вместе с тем позволю себе подискутировать с российскими коллегами по некоторым вопросам. Начну с наименования курса. Авторы предлагают сохранить его прежнее наименование. Между тем появление самостоятельной и независимой ветви государственной власти – судебной, особый статус суда в системе юстиции, занимающего в ней центральное место, дают основание отразить это и в названии курса. Поэтому более правильно вернуть ему изначальное наименование – судоустройство. Тем самым будет очевидно, что предметом курса является изучение теории и истории судоустройства, правовых норм, определяющих задачи, полномочия и организацию суда и правоохранительных органов, содействующих ему в осуществлении судебной власти, функции правосудия. Включение суда как органа судебной власти в систему правоохранительных органов принижает, неадекватно отражает роль и предназначение суда в правоохране, уравнивает его с органами, относящимися к системе исполнительной власти (органы юстиции, дознания). Что же касается системы курса, то полагаю, что он должен включать общую, особенную и специальную части. Последняя должна быть посвящена юстиции стран СНГ и иных зарубежных государств. Без этого предмет курса неоправданно сужается, превращается в пропедевтическую дисциплину.

К сожалению, авторы учебника не уделяют должного внимания дискуссионным вопросам науки судоустройства. Так, небесспорным является вопрос о видах судебных инстанций. Действующее законодательство России, как и Беларуси, дает основание для выделения не двух, а трех проверочных судебных инстанций (кассационной, надзорной и по вновь открывшимся обстоятельствам). Авторы же при рассмотрении полномочий судов и их структурных подразделений в

ряде случаев вообще не упоминают об этой судебной функции (с. 43), а ведь каждому виду судебной деятельности корреспондирует соответствующая судебная инстанция. Не выражают авторы и своего отношения к активно обсуждаемому российской юридической общественностью вопросу о наделении пленума Верховного суда Российской Федерации судебными полномочиями.

**И.И. Мартинович**

**Асновы філасофіі** (Курс лекцый) / Кіраўнікі аўтарскага калектыву і рэдактары праф. А.В.Бадакоў, Ч.С.Кірвель, дац. А.А.Бародзіч і інш. Гродна: Гродзенскі дзяржуніверсітэт імя Я.Купалы, 1994. 283с.

Курс лекцый, падрыхтаваны і выдадзены калектывам кафедры філасофіі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы, уяўляе, як адзначана ў яго прадмове, "адну з першых спроб сістэматычнага выкладання філасофіі на беларускай мове".

Стваральнікі падручніка пры сістэматычным выкладанні філасофіі і яе праблем у асноўным не пакідаюць рэчышча дыялектыка-матэрыялістычнай традыцыі, што трывала ўсталявалася ў айчыннай філасофскай свядомасці і добра карэлюе як са здаровым сэнсам, паўсядзённа-практычным вопытам чалавецтва, так і з навукай, перш за ўсё прыродазнаўствам. У той жа час аўтары імкнуцца пазбегнуць, і даволі паспяхова, характэрнай для мінулага айчыннай філасофіі дагматычнай нягнуткасці і абмежаванасці. Дасягаецца гэта ў першую чаргу насычэннем традыцыйнага праблемнага поля філасофіі новымі матывамі і новай тэматыкай і адпаведна новымі тэарэтыка-метадалагічнымі падыходамі да разгляду многіх філасофскіх праблем. У якасці такога бясспрэчна станоўчага набытку належыць перш за ўсё назваць шырока прадстаўленую ў працы праблематыку сацыяльнага дзеяння, якая дазволіла ўнесці адчувальную навізну ў аналіз і сучаснае ўспрыманне многіх пытанняў філасофіі. Гэткі ж адчувальна-станоўчы плён надае працы і актыўны зварот яе аўтараў да праблем аксіялогіі, якія доўгі час амаль не траплялі ў поле паглыбленага дыялектыка-матэрыялістычнага аналізу, а тым больш у вучэбныя дапаможнікі. Значнае ўзбагачэнне і паглыбленне філасофскай рэфлексіі дасягнута і ў выніку творчага асваення новых дасягненняў сучаснай навукі, у першую чаргу тэарэтыка-метадалагічнага інструментарыя сінэргетыкі.

Наогул высокі тэарэтычна-навуковы ўзровень выдання часам уступае ў супярэчнасць з навучальна-метадычным, дапаможным прызначэннем падручніка, некаторыя часткі якога (напрыклад, 10-я і 11-я главы) больш адпавядаюць строгім крытэрыям змястоўных філасофска-спецыялізаваных навуковых артыкулаў і наўрад ці будуць даступнымі студэнцкай моладзі.

Падручнік ствараўся ў складаны, цяжкі і супярэчлівы час, таму ён не мог не адлюстраваць сваім зместам, падыходамі і рашэннямі супярэчнасці і цяжкасці рэчаіснасці. Гэта, на наш погляд, найбольш выразна праявілася ў некрытычным стаўленні аўтараў да новых ідэалагічных клішэ і стэрэатыпаў і ў першую чаргу да канцэпцыі прыярытэтнасці агульначалавечых каштоўнасцей і адначасовым спалучэнні яе з ідэяй неабходнасці барацьбы за "новае грамадства, якое прызнае ў якасці вышэйшай каштоўнасці чалавека, а не дзяржаву, грамадства, нацыю" (с. 222). Такія сёння ходкія ў нашых філасофскіх тэкстах сцвярджэнні накшталт "агульначалавечыя каштоўнасці набываюць вырашальную ролю ў жыцці" (с. 245) з'яўляюцца ні чым іншым, як звычайным, добра вядомым прыняццем пажаданага (хай сабе актуальна і вельмі наспелага) за рэчаіснасць. Калі ж адарвацца ад абстрактных, як быццам відавочных уяўленняў аб тым, "што быць павінна" і звярнуцца да таго, што ёсць у самой рэчаіснасці, становіцца бачнай фактычная ідэалагічна-прапагандысцкая сутнасць гэтай канцэпцыі, якая, аднак, вельмі эфектыўна выкарыстоўваецца як выдатны камуфляж для дасягнення перш за ўсё стратэгічных класавых. рэгіянальных, карпаратыўных інтарэсаў, мэт і задач.

Прыкладам некрытычнага ўспрымання і тыражавання, хаця і модных сёння, але ж не адпавядаючых гістарычнай праўдзе ацэнак, можа быць і вызначэнне ў падручніку царкоўнай уніі на Беларусі як красамоўнага ўзору рэалізацыі "імкнення да аб'яднання заходняй і ўсходняй галін хрысціянства" (с. 216). Унія для аўтараў – арганічны прадукт уласцівага беларускай культуры адмаўлення ад крайнасцей. Але ж дастаткова звярнуцца толькі да аднаго гістарычнага дакумента (сёння да таго ж і лёгка даступнага) – вядомага ліста Льва Сапегі, канцлера Вялікага княства Літоўскага, бясспрэчна, непрадузятага, а таму і вераготнага сведкі тагачасных падзей, у якім ён спрабуе прытушыць і рацыянальнай аргументацыяй, і ўгаворамі, і пагрозамі неўтаймавальную агрэсіўную актыўнасць свайго адрасата, вядомага ўніяцкага архіепіскапа Ясафата Кунцэвіча, каб пераканацца ў тым, што унія была ні чым іншым, як формай каталіцкай экспансіі на праваслаўны усход, па сваёй сутнасці нават не столькі і рэлігійнай, як палітычнай. Ці варта ў святле сказанага ўносіць у падручнікі такія зусім не бяскрыўдныя зрушванні культурна-гістарычных зместаў, сэнсаў і даных, якія адкладуцца ў свядомасці недасведчанага маладога чытача адпаведнымі, не адэкватнымі гістарычнай ісціне, поглядамі і перакананнямі?

На вялікі жаль, кіраўнікі аўтарскага калектыву і рэдактары не забяспечылі скрупулёзнай вычыткі і дакладнай праўкі тэксту гэтага карыснага і так неабходнага сёння выдання, што адпаведна зніжае яго бясспрэчную культурную каштоўнасць.

У цэлым жа – гэта змястоўны, грунтоўна выкананы падручнік. Ён будзе карысным як шырокаму колу чытачоў, так і выкладчыкам, студэнтам.

**І.Ф.Габрусь, К.М.Кунцэвіч**